ЗВЯЗДА

# Рэгіёны Расіі — у Беларусі

Сумесны беларуска-расійскі інфармацыйна-інтэграцыйны праект Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь і рэдакцыі газеты «Звязда»

## Белгародская вобласць

Валерый СКРУГ:

# «Тавары беларускіх вытворцаў карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод жыхароў вобласці»

**Белгародская гандлёва-прамысловая палата — гэта недзяржаўная і некамерцыйная арганізацыя. Яе асноўная мэта — садзейнічаць развіццю гандлёва-эканамічных і навукова-тэхнічных сувязяў прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў Белгародскай вобласці з калегамі з замежных краін, у тым ліку з Рэспублікі Беларусь. Якая ж дынаміка гэтага ўзаемадзеяння з беларускімі партнёрамі? І як сур'ёзна на гэтым супрацоўніцтве адбіўся эканамічны і фінансавы крызіс? На гэтыя пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае прэзідэнт Белгародскай ГПП Валерый СКРУГ.**



— Нягледзячы на эканамічны і фінансавы крызіс, — адзначыў Валерый Сцяпанавіч, — прадпрыемствы Рэспублікі Беларусь заўсёды былі і застаюцца актыўнымі ўдзельнікамі белгародскіх выстаў. З кожным годам цікавасць беларускіх прадпрыемстваў да белгародскіх дзелавых форумаў расце, што відаць па колькасці ўдзельнікаў. Пачынаючы з 1995 года, ужо больш як дзве тысячы беларускіх прадпрыемстваў узялі ўдзел у нашых выставах. Найбольш актыўнымі іх удзельнікамі выступаюць прадпрыемствы Гомельскай, Віцебскай і Гродзенскай абласцей.

***— Якія канкрэтныя вынікі дае ўдзел беларускіх фірмаў у дзелавых форумах, што праводзяцца ў Белгарадзе?***

— Выставы, якія праводзяцца ў Белгарадзе, даюць рэальнае ўяўленне аб новых магчымасцях узаемавыгаднага супрацоўніцтва, паказваюць новыя кірункі эканамічных і знешнегандлёвых сувязяў паміж прадпрыемствамі, умацоўваюць культурныя сувязі паміж нашымі краінамі. Як вынік — усталяванне дзелавых кантактаў і партнёрскіх стасункаў беларускіх фірмаў з прадпрыемствамі Цэнтральна-Чарназёмнага рэгіёна Расіі. Тавары беларускіх вытворцаў карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод жыхароў Белгародскай вобласці, што забяспечвае паспяховую рэалізацыю гэтай прадукцыі ў нас.

***— У якіх спецыялізаваных выставах і кірмашах, што праводзяцца ў Белгарадзе, удзел беларускіх прадпрыемстваў сёння асабліва актуальны для дзелавых партнёраў з Белгародскай вобласці?***

— У цяперашні час белгародскія прадпрыемствы і прадпрымальнікі зацікаўленыя ва ўдзеле беларускіх кампаній, якія спецыялізуюцца на вытворчасці будаўнічых матэрыялаў, сельскагаспадарчай тэхнікі, тавараў народнага спажывання, харчовай прадукцыі. Таму вельмі актуальным становіцца ўдзел беларускіх прадпрыемстваў у выставе «Сучасны горад», якая будзе праходзіць у Белгарадзе з 4 па 6 жніўня, выставе «Белагратэхмаш» — з 8 па 10 верасня. Вялікай папулярнасцю карыстаецца ў белгародцаў беларуская мэбля. Выстава «Мэбля. Дрэваапрацоўка. Дом. Побыт. Утульнасць» адбудзецца 13 — 16 кастрычніка. І, вядома ж, белгародцы заўсёды рады бачыць прадстаўнікоў лёгкай прамысловасці Рэспублікі Беларусь на выставах тавараў народнага спажывання: «Белгарадэкспа» (25—27 жніўня) і «Тыдзень моды» (20—23 кастрычніка).

***— Штогод у Белгарадзе праводзіцца спецыялізаваная выстава беларускіх прадпрыемстваў. Якія тэндэнцыі характэрныя для гэтага выставачнага мерапрыемства? І якія бачацца перспектывы ў яго правядзенні?***

— Сёлета міжрэгіянальная выстава-кірмаш «Беларусь на Белгародчыне», якая стала ўжо традыцыйнай, праходзіла ў шосты раз. Яна пацвердзіла жаданне прадпрыемстваў і прадпрымальнікаў славянскіх дзяржаў да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Улічваючы зацікаўленасць нашых прадпрыемстваў у такім дзелавым узаемадзеянні, мы прапануем арганізаваць у Белгарадзе нацыянальную экспазіцыю Рэспублікі Беларусь, якая зможа прадэманстраваць дасягненні ў прамысловасці, аграпрамысловым комплексе, інвестыцыйныя прапановы і сумесныя праекты, новыя тэхналогіі і навукова-тэхнічныя распрацоўкі. У дні працы такой выставы магчыма правядзенне навукова-практычных канферэнцый, «круглых сталоў», дзелавых сустрэч, культурнай праграмы. У сваю чаргу, пры атрыманні запрашэння ад Рэспублікі Беларусь, мы гатовыя арганізаваць выставу Белгародскай вобласці ў Беларусі.

**Барыс ЗАЛЕСКІ.**



БЕЛГОРОДСКАЯ ТОРГОВО-ПРОМЫШЛЕННАЯ ПАЛАТА

БЕЛЭКСПОЦЕНТР

ПРИГЛАШАЕМ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ И ПОСЕТИТЬ ВЫСТАВКИ В БЕЛГОРОДЕ В 2010 ГОДУ

25-27 августа

БелгородЭкспо.
Мир детства. Школа

8-10 сентября

БелАгроТехМаш
Продовольствие. Напитки
Тара. Упаковка. Этикетка

13-16 октября

Мебель. Деревообработка
Дом. Быт. Уют
Приусадебный участок

Т./ф.: (4722) 58-29-41, 58-29-49, 58-29-51, 58-29-52
E-mail: belexpo@mail.ru; www.belexpocentr.ru;
г. Белгород, ул. Победы, 147-а